Funded by the European Union
BELARUS BEEHIVE



# Фандрайзінг для грамадска-культурніцкіх праектаў

Модуль 3. Краўдфандынг для грамадска-культурніцкіх праектаў

## Дадатковы матэрыял да лекцыі 3.1

## Агляд асноўных платформаў:
## падаткі і стратэгіі для беларускіх праектаў у ЕЗ

## Як зарэгістравацца ў Fanimani: 1,5% падатку без уласнага OPP-статусу

> *У большасці беларускіх арганізацый няма польскага статусу organizacja pożytku publicznego (OPP), які юрыдычна патрабуецца, каб наўпрост атрымліваць 1,5% падаходнага падатку ад польскіх падаткаплацельшчыкаў. Fundacja FaniMani сама мае статус OPP і праз праграму «Akcja FaniMani dla NGO» дазваляе іншым арганізацыям — без уласнага OPP — карыстацца яе статусам як пасярэдніка. Ніжэй — крокі рэгістрацыі і спасылкі на афіцыйныя крыніцы.*

### Крокі рэгістрацыі

**1.** Зарэгіструйце бясплатны акаўнт арганізацыі на fanimani.pl праз старонку «Zarejestruj organizację». Укажыце назву, кароткае апісанне мэты і кантактную асобу-адміністратара акаўнта.

**2.** Увайдзіце ў Панэль арганізацыі (Panel Organizacji) пад сваім акаўнтам.

**3.** Перайдзіце ў раздзел «1,5%» у левым меню панэлі.

**4.** Прыміце Рэгламент Акцыі FaniMani для НДА (Regulamin Akcji FaniMani dla NGO) — гэта і ёсць афіцыйнае далучэнне да праграмы.

**5.** Пасля прыняцця рэгламенту сістэма аўтаматычна прызначыць вам уласны **«Cel szczegółowy» — унікальны ID з 2–5 лічбаў**, які будзе бачны ў панэлі побач з назвай арганізацыі.

**6.** Дадайце нумар банкаўскага рахунку і мэту выкарыстання сродкаў (для будучай выплаты).

**7. Падзяліцеся з вашымі донарамі KRS фонду і сваім Cel szczegółowy** — гэтыя два значэнні яны павінны ўказаць у сваёй падатковай дэкларацыі PIT, каб накіраваць 1,5% менавіта вам.

**Якія даныя падаткаплацельшчык уводзіць у дэкларацыі**

| Параметр | Значэнне |
|---|---|
| KRS (агульны для ўсіх удзельнікаў акцыі) | 507234 (Fundacja FaniMani) |
| Cel szczegółowy | Ваш індывідуальны ID (2–5 лічбаў) — прысвойваецца аўтаматычна пасля прыняцця рэгламенту |

**Тэрміны і выплаты**

- Сродкі, сабраныя праз Акцыю FaniMani для НДА за год, выплачваюцца да канца лістапада.
- Пасля 15 лістапада фонд дасылае email з вынікамі акцыі і заявай на выплату для подпісу.

**Афіцыйныя крыніцы**

Галоўная старонка FaniMani — https://fanimani.pl/

Рэгістрацыя арганізацыі — https://fanimani.pl/rejestracja-organizacji/

Калі выплачваюцца сродкі з Акцыі FaniMani для НДА — https://fanimani.pl/pomoc/dla-organizacji/akcja-fanimani/kiedy-wyplacane-sa-srodki-z-akcji-fanimani-dla-ngo/

Наладкі OPP — для арганізацый з уласным статусам OPP — https://fanimani.pl/pomoc/dla-organizacji/zarzadzanie-kontem-organizacji/ustawienia-opp-na-potrzeby-zbierania-1-5-podatku/

Цэнтр дапамогі FaniMani (усе раздзелы) — https://fanimani.pl/pomoc/

> ***Важна!*** *Гэты матэрыял мае інфармацыйны характар і не з'яўляецца юрыдычнай кансультацыяй. Умовы праграм FaniMani (у тым ліку камісіі, патрабаванні да дакументаў і тэрміны выплат) могуць мяняцца — перад удзелам рэкамендуецца праверыць актуальны Рэгламент непасрэдна на fanimani.pl або звярнуцца да бухгалтара, знаёмага са спецыфікай НДА ў Польшчы.*